Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

## Аб Рэспубліканскай выстаўке манументальнага мастацтва

09.09.2011

13 верасня 2011 года ў 17-00 у галерэі “Лабірынт” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па ініцыятыве Міністэрства культуры пачынаецца новы творчы праект – адбудзецца адкрыццё Рэспубліканскай выстаўкі манументальнага мастацтва.

Мэта правядзення выстаўкі – паказаць найлепшыя творы манументальнага мастацтва, якія былі створаны за 20-годдзе беларускай дзяржаўнасці і яскрава прадстаўляюць беларускую нацыянальную мастацкую школу. На выстаўцы будзе прэзентавана рэтраспектыва манументальнага мастацтва ўсіх рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь – помнікі, вітражы, роспісы, прадстаўленыя ў выглядзе фотаздымкаў.

У рамках праекта адбудзецца выстаўка работ студэнтаў і выкладчыкаў кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. На базе Акадэміі мастацтваў пройдзе таксама навукова-практычная канферэнцыя. Плануецца падрыхтаваць спецыяльнае выданне, прысвечанае манументальнаму мастацтву Беларусі.

Грамадскае аб’яднанне “Беларускі саюз мастакоў” плануе ў рамках дадзенага мерапрыемства выстаўку твораў секцый манументальнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Арганізатарамі праекта з’яўляюцца Міністэрства культуры, абласныя і Мінскі гарадскі выканаўчыя камітэты, грамадскае аб’яднанне “Беларускі саюз мастакоў”.

*Запрашаем прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі да супрацоўніцтва ў асвятленні мерапрыемстваў Рэспубліканскай выстаўкі манументальнага мастацтва.*